ЯНА ЖЫВЕ ГАНДБОЛАМ...

Як Польшча прымае гасцей і праводзіць матчы чэмпіянату Еўропы

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Дар'я Лабажэвіч перадае з Катавіц

Заўзятары ўжо паспелі асвоіцца ў горадзе, журналісты — наладзіць сваю працу на новым месцы, а гандбалісты — адчуць смак першых перамог і паражэнняў: кантынентальнае першынство ў самым разгары.

Адчуць эмоцыі

Сёння ў Катавіцах, дзе выступаюць каманды групы В (а гэта зборныя Беларусі, Ісландыі, Нарвегіі і Харватыі), працуе больш за 150 журналістаў. Большасць прадстаўнікоў СМІ з Ісландыі — 90 чалавек, нямала нарвежцаў, харватаў і палякаў, мы — у меншасці. Калі работнікі масмедыя перш за ўсё збіраюцца ў прэс-цэнтры, то галоўным месцам збору гасцей з замежжа, аматараў гандбола ў гэтыя дні з'яўляецца фан-зона, якая размешчана перад арэнай «Сподэк», дзе і праходзяць гульні. У першы дзень турніру тут было шматлюдна, арганізатары адзначаюць, што фан-зону наведала каля паўтысячы заўзятараў.

— Падрыхтоўка да чэмпіянату — гэта доўгая дарога, — расказвае **галоўны чалавек у медыясупольнасці, шэф прэс-цэнтра Крыстафор КЛЕПАШЫНСКІ.** — Арганізацыйны камітэт пачаў работу 3 гады таму. Каманда гэтых жа людзей рыхтавала мінулы чэмпіянат Еўропы па футболе. Заўсёды можна зрабіць крыху больш, але ў цэлым, я думаю, мы стварылі камфортныя ўмовы для гасцей.

Сапраўды, Польшча ў гэтыя дні жыве гандболам: на вуліцы шматлюдна і нават такі індустрыяльны горад, як Катавіцы ператвараецца ў яркае мястэчка з натоўпамі радасных фанатаў. Рознакаляровыя, смешныя, яны размаўляюць на розных мовах, але жывуць адным — святам гандбола. Слоган чэмпіянату — feel the emotions (адчуваць эмоцыі), і тут яны сапраўды ёсць.

Не кожны матч збірае аншлагі, але праходзяць гульні далёка не ў пустой зале, на першай сустрэчы з удзелам зборнай Беларусі, напрыклад, на трыбунах было 7 тысяч гледачоў. У другі гульнявы дзень лік заўзятараў павялічыўся, білетаў у касах няма.

Сярод яркіх колераў на трыбунах, вядома, ёсць і беларускія сцягі. Наша прадстаўніцтва і тут не ў большасці, але каля сотні землякоў дакладна ёсць. Хтосьці з іх прыехаў «пахварэць» за зборную ўпершыню, ну а хтосьці ўжо заўзятар са стажам. Напрыклад, мілая дзяўчына **Наталля з Мінска** наведвае ўжо не першы чэмпіянат, таму можа параўнаць яго і ў плане гульні, і ў плане арганізацыі.

Ці стане шчаслівай для нас арэна «Сподэк»?

— Для мяне гэта ўжо трэцяе буйное спаборніцтва разам з нашай зборнай: у 2013 годзе мы былі ў Іспаніі, у 2015-м — у Катары. У юнацтве сама гуляла ў гандбол, таму працягваю цікавіцца ім і сёння. У Катавіцах шмат банераў, усё нагадвае пра чэмпіянат. Напрыклад, калі мы былі на планетарным першынстве ў Іспаніі, мясцовыя жыхары нават не ведалі, што ў іх краіне праходзіць чэмпіянат свету — не было ніякай рэкламы, атрыбутыкі. Польшча ў гэтым плане, вядома, вельмі адрозніваецца. Палякі самі вельмі любяць гандбол, іх шмат на трыбунах. А што тычыцца нашай зборнай, то хлопцы вялікія малайцы, яны выдатна выступаюць і заслугоўваюць як мінімум выхаду ў наступны раўнд, — адзначае Наталля.

Талерка для спорту

Трохі пра тое месца, дзе праходзяць галоўныя падзеі чэмпіянату ў нашай групе. Спартсмены праводзяць матчы на арэне «Сподэк» — гэтая назва невыпадковая, вонкава спартыўны будынак нагадвае менавіта сподак. Стадыён змяшчае 11 тысяч гледачоў і знаходзіцца ў самым цэнтры горада, побач — вакзал, гасцініцы і буйныя гандлёвыя цэнтры. Сама арэна пабудавана ў 1971 годзе, праз 5 гадоў пасля яе адкрыцця стадыён прымаў чэмпіянат свету па хакеі. Менавіта тут адбылася знакавая падзея ў гісторыі польскага спорту і адна з самых сенсацыйных у гісторыі хакея. Зборная СССР тады саступіла камандзе Польшчы 4:6, легендарныя Харламаў, Якушаў, Трацяк не змаглі супрацьстаяць сваім сапернікам.

Сёння «Сподэк» прымае турніры па розных відах спорту, але больш выкарыстоўваецца для правядзення канцэртаў, выстаў і цыркавых шоу.

Сталіца Верхняй Сілезіі

Калі казаць пра сам горад, то Катавіцы ў Польшчы называюць сталіцай Верхняй Сілезіі. Гэта цэнтральнае месца вугальнай прамысловасці (першая шахта тут з'явілася яшчэ ў XVIII стагоддзі). Але, нягледзячы на сваю індустрыяльнасць, у горадзе ёсць на што паглядзець. Цікавая архітэктура прадстаўлена касцёлам Найсвяцейшай Панны Марыі (ён выкананы ў стылі новай готыкі), саборам Хрыста Збавіцеля ў барочным стылі і драўлянай царквой святога архангела Міхаіла. Акрамя гэтага, сёння горад называюць цэнтрам культуры і дзелавога турызму ў Польшчы. Нядаўна побач са «Сподкам» з'явіўся новы мікрараён, так званая зона культуры: тут і міжнародны кангрэс-цэнтр, і будынак сімфанічнага аркестра Польскага радыё і новы Сілезійскі музей. Усё гэта размешчана на тэрыторыі былой шахты «Катавіцы».

Даведка:

Чэмпіянат Еўропы па гандболе сярод мужчынскіх камандаў праходзіць 12-ы раз, Польшча гэты турнір прымае ўпершыню. Гульні чэмпіянату на групавым этапе праходзяць у чатырох гарадах: Кракаве, Катавіцах, Вроцлаве і Гданьску, затым каманды, якія працягнуць барацьбу, пераедуць у сталіцу. На Еўра выступае 16 зборных, сярод якіх дзейны чэмпіён — Францыя. Адзначым, што сёлетні чэмпіянат Еўропы з'яўляецца адборачным этапам на Алімпіяду ў Рыа-дэ-Жанейра.

Польшча, Катавіцы

ЗАЦЯЖНАЯ СЕРЫЯ НЯЎДАЧ

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра тое, як мінскае «Дынама» церпіць трэцяе паражэнне запар у выязной серыі чэмпіянату КХЛ, а беларускія біятланісткі страчваюць шанц трапіць на п'едэстал у эстафетнай гонцы пятага этапу Кубка свету.

1. Хакеісты мінскага «Дынама» з буйным лікам саступілі омскаму «Авангарду» 1:8. Гэта ўжо трэцяе паражэнне запар у выязной серыі з вядучымі камандамі Усходняй канферэнцыі; раней падапечныя Андрэя Кавалёва саступілі магнітагорскаму «Металургу» (1:5) і ўфімскаму «Салавату Юлаеву» (3:4).

— Сапернік дамінаваў ва ўсім. У нас не атрымалася практычна нічога. Віншую «Авангард» з перамогай. Гэты матч будзе нам добрым урокам. Мы папярэджвалі гульцоў перад сустрэчай, як дзейнічаць у першым перыядзе, але, на жаль, не дастукаліся да іх, — адзначыў **галоўны трэнер Андрэй КАВАЛЁЎ** пасля сустрэчы ў Омску.

Завершыцца выязная серыя «зуброў» сёння матчам з астанінскім «Барысам».

2. Жаночай эстафетнай гонкай 4х6 км у нямецкім Рупольдынгу завяршыўся пяты этап Кубка свету па біятлоне. Зборная Беларусі заняла там 13-е месца, а пераможцамі сталі ўкраінскія біятланісткі. Другія — немкі, трэцімі фінішавалі спартсменкі з Італіі.

Наступны кубкавы этап пройдзе з 21 па 24 студзеня ў італьянскім Антхольцы.

3. У Мінску стартаваў розыгрыш Кубка развіцця, у ім бяруць удзел юнацкія каманды з 12 краін. Футбалісты зборнай Беларусі прадстаўлены гульцамі, не старэйшымі за 1999 год нараджэння. У стартавым паядынку групы А яны сустракаліся з камандай Ірана і перамаглі з лікам 3:1.

Сёння беларусы згуляюць са зборнай Латвіі, 20 студзеня сустрэнуцца са славакамі. Пасля завяршэння першага этапу каманды, якія занялі 1—3 месцы, разыграюць у аднакругавым турніры ўзнагароды спаборніцтваў. Вырашальныя матчы адбудуцца 24 студзеня.

Адзначым, што такі юнацкі турнір праводзіцца ўжо 12-ы раз. Чатыры разы яго пераможцамі станавіліся расійскія футбалісты (2008, 2010, 2014, 2015), па два разы галоўны прыз выйгравалі каманды Беларусі (2006, 2007), Украіны (2009, 2012), Бельгіі (2011, 2013), пераможцамі першага турніру ў 2005 годзе стала зборная Сербіі і Чарнагорыі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

СПАРТЫЎНЫЯ ВА ЎСІМ

Сумесна з Беларускай федэрацыяй гандбола газета «Прэсбол» з нагоды свайго 25-годдзя зладзіла сапраўднае спартыўнае свята

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

Спачатку на пляцоўку Рэспубліканскага цэнтра алімпійскага рэзерву па гандболе выйшлі дзеткі, а пасля — каманда «Прэсбола», якой супрацьстаяла зборная беларускіх журналістаў, складзеная на базе тэлеканала «Беларусь 5». У матчы прыняў удзел і спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Тарас Шчыры. А вось вароты прэсболаўцаў у тым ліку абараняў Сяргей Сафар'ян, першы намеснік старшыні Беларускай федэрацыі футбола. І рабіў гэта, між іншым, нядрэнна. Сяргей Вагаршакавіч не адзін раз выратоўваў каманду і адбіваў даволі непрыемныя кідкі. Першая палова прайшла ў напружанай барацьбе, аднак пасля перапынку прэсболаўцы ўсё ж такі перахапілі ініцыятыву і атрымалі перамогу з лікам 18:10.

Пасля завяршэння сустрэчы ўсіх прысутных чакаў яшчэ адзін сюрпрыз. Гледачам, а іх было нямала, прэзентавалі гандбольную «Каманду мары», якую склалі паспяховыя і вядомыя ў Беларусі дзяўчаты. Сярод іх — Міс Беларусі — 2008 Вольга Хіжанкова, спявачка Вера Карэтнікава, фатограф Дар'я Буракіна, лідар спартыўна-дабрачыннага праекта «Мары здзяйсняюцца» Настасся Касянкова, уладальніца Кубка свету па кікбоксінгу Карына Аляксандрава і іншыя. Дзяўчаты ўжо кінулі выклік расійскаму тэлеканалу «Матч ТБ», генеральным прадзюсарам якога выступае тэлевядучая Ціна Кандэлакі. Што ж, чакаем вестку з Масквы.

Якаў ЖУРБІН. *taras@zviazda.by*

ГУЛЬНЯ, ПРА ЯКУЮ МЫ МАРЫЛІ

...Гэты матч ужо ўвайшоў у гісторыю. Ніколі раней матчы кантынентальнага першынства не вызначаліся такой выніковасцю — беларусы і ісландцы разам закінулі ў вароты адзін аднаго 77 мячоў (такога яшчэ не было)! На шчасце, нашы — на адзін больш за саперніка.

Сёння беларусы правядуць свой трэці паядынак на чэмпіянаце. Менавіта ён і вырашыць, ці пройдзем мы ў наступны раўнд кантынентальнага першынства.

Нашы і да Катавіц дабраліся...

А пачыналі падапечныя Юрыя Шаўцова сваё выступленне на чэмпіянаце Еўропы паядынкам з харватамі. Не вельмі ўдала. Нягледзячы на больш чым сур'ёзнага саперніка (харвацкая каманда з'яўляецца адной з самых тытулаваных камандаў Еўропы апошніх двух дзесяцігоддзяў, хоць заваёўвала ўсяго двойчы золата Алімпіяд і адзін раз перамагала на чэмпіянаце свету), беларусы ў першым тайме матча навязалі ўпэўненую барацьбу і не адпусцілі апанентаў далёка. Аднак у другой палове сустрэчы нешта зламалася, на ўсіх франтах з'явіліся памылкі, якімі не маглі не скарыстацца харваты, у выніку пройгрыш — шэсць мячоў (21:27).

А вось на другі паядынак, са зборнай Ісландыі, дружына Юрыя Шаўцова выйшла з непрыхаваным жаданнем перамагаць. Гандбол у Ісландыі часта называюць нацыянальным відам спорту. Зборная краіны па гандболе з'яўляецца адной з самых моцных у свеце, яна выйграла сярэбраны медаль на летніх Алімпійскіх гульнях 2008 года ў Пекіне і бронзавы — на чэмпіянаце Еўропы-2010. Гэта было даўнавата, і суровыя прадстаўнікі Краіны ільдоў прыехалі ў Польшчу не проста нагадаць пра сябе, а з жаданнем вярнуць былую славу. Але ж...

Выдатная гульня ў варотах маладога галкіпера Вячаслава Салдаценкі, упэўненая абарона і эфектыўнае нападзенне. Усю першую частку сустрэчы каманды ішлі мяч у мяч. А ў пачатку другога тайма раптам здарыўся адрыў ісландцаў у 4 мячы, і тут падумалася, што быць чарговаму паражэнню, але ў трэнера беларусаў знайшоўся іншы план. «Я не думаў пра лічбы на табло, я думаў, што нам рабіць далей», — скажа Юрый Анатолевіч на пасляматчавай прэс-канферэнцыі.

У двух вырашальных момантах сустрэчы коўч выпускае на пляцоўку маладога Вячаслава Куляша. Армеец спачатку зраўноўвае лік, а потым і прыносіць перамогу нашай камандзе (39:38).

Яны здзівілі скептыкаў і даставілі неверагодную радасць заўзятарам. Беларусы перамаглі ў самым выніковым матчы чэмпіянату Еўропы, а сёння будуць біцца з нарвежцамі, каб працягнуць барацьбу на турніры.

Юрый ШАЎЦОЎ:

— Гэта быў адкрыты гандбол з абодвух бакоў, каманды былі нацэлены на хуткую гульню, лік гаворыць сам за сябе. Абарона, відавочна, не была на першым плане. Каманда праявіла волю да перамогі, я за іх вельмі рады.

Барыс ПУХОЎСКІ:

— Мы вельмі хацелі атрымаць перамогу ў гэтай сустрэчы і зрабілі для гэтага ўсё, што маглі, аддалі ўсе сілы, каб парадаваць балельшчыкаў і сябе. Гэта вельмі важная вікторыя для нас, і мы спадзяёмся, што яна стане толькі пачаткам. Дзякуй усім, хто ў нас верыў і верыць сёння.

Спартак МІРАНОВІЧ:

— Каманда згуляла значна лепш, значна мацней другую гульню, чым першую. Сёння ў камандзе Шаўцова кожны на сваім месцы. Разам яны зрабілі цуд, праявілі ўсе свае лепшыя бакі. Яны малайцы, таму што Ісландыя, як і ўсе астатнія каманды ў нашай групе, вельмі моцныя, еўрапейскага ўзроўню калектывы, і выйграць у іх цяжка. Менавіта таму апошні гульнявы дзень у падгрупе выявіць пераможцу і тую каманду, якая паедзе дадому.

Сяргей РУТЭНКА:

— Матч з ісландцамі быў вельмі цяжкім, але на гэтым нічога не заканчваецца. Цяпер шмат эмоцый, але мы павінны прыйсці ў сябе, усё ўсвядоміць і ісці далей. У гэтай гульні выклалася ўся каманда: толькі так можна перамагаць моцнага саперніка. Не магу сказаць, што мы не стараліся ў першым матчы. Проста там было шмат памылак, але не ад таго, што мы не хацелі гуляць.

Становішча камандаў пасля двух тураў: Харватыя — 2 ачкі (розніца мячоў — 58-55), Нарвегія — 2 (59-57), Ісландыя — 2 (64-64), Беларусь — 2 (60-65).

У наступны раўнд чэмпіянату Еўропы выйдуць па 3 каманды з кожнай падгрупы.